Cana 10 hr. Pierasyłka apłačana ryčałtam

Nr. 11 (652). Wilnia, Niadziela 8 Sakawika 1936 h. Hod XII (XX)

БЕЛАРУСКАЯ КРЫНІЦА | BIEŁARUSKAJA KRYNICA

Palityčnaja, hramadzkaja i litaraturnaja hazeta.

Adras Redakcyi i Administracyi: WILNIA, ZAWALNAJA 1—1 (Wilno, Zawalna 1—1). Redakcyja adčyniena ad 9 hadz. ran. da 4-aj uwieč.	HAZETA WYCHODZIĆ RAZ U TYDZIEŃ.	Košty wydawańnia pakrywajuć składki. Padpiska u hod 4 zał., na paŭhoda — 2 zał., na 3 miesiacy — 1 zał.

За родную школу!

АДОЗВА

Да Беларускага Народу

ГРАМАДЗЯНЕ БЕЛАРУСЫ!

Цьвёрда і настойліва ідзе Беларускі Народ да лепшае долі. Ня гледзячы на вялікія перашкоды, якія ляглі на дарозе, Ён будуе новае жыцьцё. Думка вызваленьня, думка жыць так, як і ўсе культурныя народы жывуць, глыбака закаранілася ў народныя масы. Горад і вёска, сяляне і работнікі — ўсе сьведамыя Беларусы дружна ўзяліся да працы на роднай ніве.

Але каб збудаваць лепшую будучыню, **трэба здабыць сваю родную беларускую школу**. Гэта разумеюць беларусы і ўжо ад многіх гадоў дамагаюцца свае роднай школы.

ГРАМАДЗЯНЕ БЕЛАРУСЫ!

Патрэбу вучэньня разумее кожны. Выпраўляць дзяцей у школу прыходзіцца ня толькі дзеля школьнага прымусу, але і дзеля таго, каб дзеці навучыліся чытаць і пісаць і каб здабылі патрэбную асьвету, бо цяжка цяпер жыць чалавеку без асьветы. Школа ў нашыя часы ёсьць неабходная, як дзеля духовых патрэб чалавека, так дзеля цяжкага штодзеннага змаганьня за кавалак хлеба. Чалавек без асьветы ў нашыя часы можа быць толькі слугой — нявольнікам, якога слабасьць кожны выкарыстоўвае. У жыцьці-ж грамадзкім бяз добрай школы ня можа быць поўнага нацыянальнага і культурнага адраджэньня, ня можа быць і матарыяльнага дабрабыту.

Беларусы! Наш ратунак — гэта наша родная беларуская школа. Гэта наш фундамэнт, на якім мы павінны будаваць новае лепшае жыцьцё! Цяжка нам сваей школы дабіцца, але ўсё-ж такі мы маем сьвяты абавязак усімі сіламі дамагацца, каб закон, які прызнае беларускую школу — быў праведзены ў жыцьцё. На падставе школьнага закону з дн. 31.VII.1924 г. усе Беларусы ў Віленскім, Наваградзкім, Палескім і часьці Беластоцкага ваяводзтваў маюць права дамагацца школ беларускіх на кошт казны. Патрэбны толькі подпісы бацькоў на адумысловых дэклярацыях з дамаганьнем беларускае школы.

Праўда, дагэтуль школ нам на падставе гэных дэклярацыяў не адкрылі. Але ці гэта знача, што мы маем маўчаць?—Не! Яшчэ з большым націскам мы павінны паўтарыць нашыя дамаганьні, тымбалей, што Віленскі Школьны Куратар у лістападзе 1935 году, на паседжаньні польскіх паслоў і сэнатараў публічна заявіў, што Беларусы свае школы ня хочуць і яе не дамагаюцца. Вось-жа нашым абавязкам ёсьць заявіць, што мы, Беларусы, як дамагаліся, так і дамагаемся свае беларускае школы. Няхай пакаленьні, што прыдуць пасьля нас, з гордасьцяй успомняць, як іх продкі стойка змагаліся за сваё сьвятое права — права на родную беларускую школу!

Бацькі Беларусы! Калі вы хочаце, каб дзеці вашыя не выракаліся сваіх сярмяжных бацькоў, любілі мазольную працу, сваю мову, Бацькаўшчыну і Ёй служылі, калі хочаце вызваленьня нашага народу з путаў цемры і нядолі — дык **неадкладна дамагайцеся сваей роднай беларускай школы.**

Беларуская школа ёсьць мілейшая і бліжэйшая да душы нашых дзетак.

Навука ў роднай беларускай мове больш зразумелая для нашых дзетак, як у чужой мове.

Беларуская школа дае лепшую падгатоўку да жыцьця: яна ня ломіць душы дзіцяці, яна ўзбагачае розум новымі паняцьцямі і гэтым памагае яго разьвіцьцю. Беларуская школа ня толькі вучыць у роднай мове, але навучае і іншых моваў, якія патрэбны ў жыцьці, — словам, родная школа дае беларускаму дзіцяці ўсё, што будзе яму патрэбным у далейшым жыцьцёвым змаганьні.

Дык, для дабра нашых маладых пакаленьняў, для дабра ўсяго нашага Народу, кожны Беларус-бацька ці апякун дзяцей мусіць выпаўніць свой абавязак і ў гэтым 1936 годзе павінен падпісаць і падаць школьным уладам дэклярацыю

на сваю родную беларускую школу!

Па дэклярацыі, фармуляры і інструкцыі зварочвайцеся на адрас: Школьны Сакратарыят: Вільня, Каралеўская вул. 3—8.

Вільня, 29 лютага 1936 году.

БЕЛАРУСКІ ІНСТЫТУТ ГАСПАДАРКІ І КУЛЬТУРЫ. *ТАВАРЫСТВА БЕЛАРУСКАЕ ШКОЛЫ.*

Доктар Фр. Скарына — прадвесьнік беларускага адраджэньня

(У чэсьць 450-лецьця яго нараджэньня: 1486—1936).

Пад славамі: беларускае адраджэньне звычайна разумеем сучасную барацьбу й працу беларускага народу за яго нацыянальную, культурную й палітычную самабытнасьць. Пачатак гэтага адраджэньня звычайна выводзіцца ад часу ў нас романтызму, з другой паловы XIX ст.

Тымчасам гэта ня сусім так. Пачаткі адраджэньня беларускага народу знаходзяцца ў першай палове XVI ст., яны цесна зьвязаны з выдавецкай і літаратурнай працай вялікага беларускага культурніка таго часу Фр. Скарыны.

Радзіўся Скарына, як даказвае праф. М. Шчакаціхін, у 1486 г. у Полацку. Бацька яго Лука меў там маемасьць і займаўся гандлем. Малады Скарына вучыўся сьпярша дома царкоўна-славянскай граматы.

У 1504 г., дзякуючы зносінам Полацка з культурнымі цэнтрамі краёвымі і суседнімі, 18-летні Скарына дзеля навукі апынуўся ў Кракаве. Вучыўся ён тут модных тады так зв. сямёх вызваленых навук, пацяперашняму: філёзофіі, ці яшчэ лепш—навук гуманістычных. У 1506 г. дастаў ён тут званьне бакалара філёзофіі.

Праз наступных гадоў шэсьць Скарына прабываў далей заграніцай, студыюючы філёзофію, мэдыцыну й багаслоўе. У гэтым часе атрымаў ён, бліжэй нявéдама дзе, званьне доктара філёзофіі.

У 1512 г. наш Скарына знаходзіцца ў Падуі (Італія), дзе здае экзамен на доктара мэдыцыны.

У 1517—19 г. Скарына прабывае ў чэскай Празе, дзе наладжвае друкарню, у якой друкуе Псалтыр і 22 іншыя біблейскія кніжкі старога Закону, пераложаныя на тагочасную беларускую мову. «Біблія руска выложена доктором Франціском Скоріною із славнаго града Полоцка, Богу ко чті і людіем посполітым к доброму поученію» — гэткі Скарына даў загаловак сваім праскім перакладам.

На гэтым выдавецкая беларуская праца Скарыны ў Празе перарываецца. У 1525 г. спатыкаем яго ўжо ў Вільні, дзе ён наладжвае друкарню дзеля далейшай сваей тэй-жа працы. З гэтай друкарні ў 1525 г. выходзе «Апостол» і «Малая подорожная кніжіца». Мова гэтых кніжак так-жа шмат у чым зблізана да тагочаснай жывой беларускай мовы.

На гэтым выдавецкая беларуская праца Скарыны спыняецца цалком. Пасьля гэтага Скарына наш прабывае ў Кенігсбэргу ў караля Альбрэхта, у Пазнані і ўрэшце ў Вільні. Калі ў 1530 г. пакідаў Кенігсбэрг, дык намовіў і забраў з сабой нейкага жыда, так-жа доктара й друкара. Відаць думаў яшчэ далей працаваць на беларускай выдавецкай ніве. Аднак да гэтага ўжо ў яго не дайшло.

У тых-жа трыццатых гадох XVI ст. Скарына наш быў у Вільні і займаў пасаду лекара й сакрэтара ў віленскага біскупа.

Час сьмерці Скарыны нявéдамы. Ведама, што жыў ён яшчэ ў 1535 г., а можа ў 1536.

Вялікая заслуга Скарыны ў тым, што ён біблію, як найгалаўнейшую на той час крыніцу асьветы, з царкоўна-славянскай мовы пералажыў на мову беларускую. Беларускі народ ужо тады шмат чаго не разумеў у царкоўна-славянскай мове. Вось-жа, каб яму аблягчыць разуменьне, Скарына, царкоўна славянскі тэкст біблії пераклаў на тагочасную мову беларускую або прынамсі замяніў незразумелыя чужыя словы славамі зразумелымі, узятымі з жывой беларускай мовы.

Калі-б Скарына сядзеў у Полацку, дык пэўне да гэткай думкі не дайшоў-бы. Але прабываючы ў шырокім сьвеце і бачачы, як немцы, чэхі і іншыя

народы перакладалі біблію з лацінскай няжывой мовы на мовы народныя, а так-жа бачачы, як гуманісты высока пачыналі цаніць жывую народную мову ў культурным жыцьці народу,— як патрыёт, Скарына захапіўся гэвай працай і гэнымі ідэямі і нешта падобнае пачаў рабіць на родным беларускім грунце.

Праца Скарыны мае вялікае значэньне. Друк заўсёды служа нязьбітым доказам культуры народу. Хронолёгічна біблія Скарыны займае трэцяе месца (першае належа біблії нямецкай — 1455, другое чэскай — 1488). Сярод-жа маскоўцаў і ўкраінцаў беларуская біблія Скарыны ёсьць ня толькі першай друкаванай біблiяй, але першай у народнай мове.

Але найбольшае значэньне для нас сяньня працы Скарыны ў тым, што ён першы, яшчэ ў XVI ст., пачаў культурнае адраджэньне беларускага народу, апіраючыся на беларускім нацыянальным грунце.

Праўда, пасьля гэтай вялікай і такой удалай спробы Скарыны адраджаць беларускі народ на грунце нацыянальнай культуры, прыйшоў заняпад, але гэта сталася дзякуючы няспрыяючым Беларусі палітычным варункам. І калі-б ня гэныя палітычныя варункі, якія заглушылі адраджэнскія пачынаньні Скарыны, дык-бы сяньня беларусы жылі-б ужо поўным сваім культурным і палітычным жыцьцём.

Але й бяз гэтага, пачаткі скарынаўскай адраджэнскай працы сяньня для беларускага сучаснага адраджэньня зьяўляюцца тым ідэовым элемэнтам, які злучае ў вадну цэласьць нашу мінуўшчыну з сучаснасьцяй і які паказвае гэтаму адраджэньню далейшую простую і цьвёрдую дарогу.

Вялікі наш і слаўны доктар з Полацка Францiш Скарына— гэта сапраўды прадвесьнік адраджэньня беларускага народу.

З БЕЛАРУСКАГА ЖЫЦЬЦЯ

Лекцыя кс. рэд. Ад. Станкевіча. У нядзелю 1.III. сёл. у залі Бел Інстытуту Гаспадаркі і Культуры ў Вільні адбылася публічная лекцыя кс. рэд. Ад. Станкевіча на тэму: „Францiш Скарына і яго праца". Лекцыя была вельмі цікавая, у якой прэлегент падаў шмат новага матэр'ялу аб Скарыне. Як заля, так усё памешканьне Інстытуту было перапоўнена народам.

Лекцыя кс. В. Гадлеўскага. У нядзелю 8-га сакавіка сёл. у залі Бел. Інстытуту Гаспадаркі і Культуры ў Вільні пры Завальнай вул. 1—1 старшыня Інстытуту кс. В. Гадлеўскі прачытае навукова-папулярную публічную лекцыю на тэму: „Тварэньне Вялікага Княства Літоўскага і Беларусь". Пачатак лекцыі а гадзіне 17-ай. Уход вольны і бясплатны.

Агульны гадавы сход Бел. Студ. Саюзу. 23 лютага сёлета ў залі галоўнага гмаху У. С. Б. адбыўся агульны гадавы сход сяброў Бел. Студ. Саюзу. Справаздачу з дзейнасьці Саюзу за ўвесь мінулы год зрабіў старшыня ўступаючага Ўраду М. Шчорс, які зьвярнуў асаблівую ўвагу на патрэбу культурна-асьветнае працы студэнтаў сярод бел. сялянства. Пасьля справаздачы адбылася дыскусія, у часе якой быў намечаны плян дзейнасьці Саюзу на будучыню. Пастаноўлена, між іншым, інтэнсыўней вясьці працу над нацыянальным усьведамленьнем і асьветай бел. масаў.

У новы Ўрад Б. С. С. выбраны: М. Шчорс — старшыня, В. Рубін— віцэ старшыня, Сухая — скарбнік, Канцэлярчык — сакратар і Казак — гаспадар.

З беларускага жыцьця ў Літве. Дня 23 лютага сёлета адбыўся V гадавы зьезд сяброў Беларускага Культурна - Прасьветнага Таварыства, на якім уступаючы Урад здаў справаздачу з дзейнасьці Таварыства за 1935 год і быў выбраны новы Урад. У новы Урад увайшлі: А. Матач, С. Якавюк, О. Кошкін, М. Чэркас і С. Кунаховіч.

Пасьля зьезду Бел. Народ. Тэатр зладзіў спэктакль-баль. Былі адыграны: камэдыя Фр. Аляховіча „Чорт і баба" і абразок „Вылячыў".

Z litoŭskaha žyćcia

*

Kanfiskata. „Vilniaus Rytojus" Nr. 19 z dnia 3.III. siol. administracyjnymi ŭładami skanfiskawany. Pa kanfiskacie wyjšła druhoje wydańnie taho-ž numaru.

Wysielenyja litoŭcy. Starasta Wilenska-Trockaha paw. wysieliŭ z taho-ž pawietu 7 litoŭcaŭ, kiraŭnikoŭ čytalniaŭ „Rytas."

Zakrywajuć i nie dajuć dazwołu. Administracyjnyja ŭłady, jak widać z litoŭskich hazet, mnohija ŭ Wilenščynie litoŭskija praświetnyja arhanizacyi zakrywajuć, a isnujučym časta nie dajuć dazwołu na wiečaryny i teatralnyja pradstaŭleńni.

Starastwa i Lit. Nac. K-t. Sioleta 31.I i 1, 3 i 4.II pradstaŭniki Wilenskaha Haradzkoha Starasty ŭ Lit. Nac. K-cie prawiali kantrolu. 20.II K-t hety atrymaŭ ad Starasty piśmo, u jakim skazana, što K-t pawinien da 1.III padać Starastwu nowy statut z prośbaj zaćwierdzić jaho.

Nie zaćwierdzili T-wa litoŭskich žančyn. Wilenskija litoŭskija žančyny jašče ŭ 1930 hodzie padali Wilenskamu Wajawodzie statut swajej žanočaj arhanizacyi i prasili jaho zaćwierdzić. 20.II.36 nadyjšoŭ adkaz admoŭny.

*

Litwa, Łatwija i Estija, jakija żywuć u blizkim sajuzie, robiać zachady, kab u Lizie Narodaŭ mieć sabie stałaje miesca.

Miž Litwoj i Niamieččynaj adnosiny značna palepšylisia. U chutkim časie majuć pačacca miž hetymi dziaržawami handlowyja pierahawory. Dobrasusiedzkija adnosiny miž Litwoj i Niamieččynaj dla abiedźwioch staron majuć ważnaje značeńnie jak ekanamičnaje, tak i palityčnaje.

Pamiatnik Dariusu i Girenasu. Wiedamym litoŭskim latunom Dariusu i Girenasu, jakija źhinuli śmierciaj hierojaŭ u niamieckim lesie, latučy z Ameryki ŭ Litwu, na miescy katastrofy budzie pastaŭleny pamiatnik. Niamieckaja ŭłada na heta ŭžo zhadziłasia.

Amnestyja. Prezydent Litwy z nahody świata Niezaležnaści Litwy darawaŭ karu mnohim wiaźniam.

U Złuč. St. Ameryki litoŭcaŭ znachodzicca da 700.000. Mnohija z ich, choć jašče pomniać, što jany litoŭcy, ale pa litoŭsku hawaryć užo nia ŭmiejuć.

З Украінскага жыцьця

Украінская справа ў польскім Сойме. Частка ўкраінскай інтэлігенцыі, што аб'еднаная ў арганізацыі УНДО, як ведаем, пайшла на ўгоду з польскім урадам, цяпер мае сваіх прадстаўнікоў у польскім парлямэнце. Гэтыя прадстаўнікі на сёлетняй буджэтнай сэсіі Сойму, у дыскусіі над дзяржаўнымі расходамі і даходамі, між іншым, аб палажэньні украінцаў пад Польшчай гаварылі гэтак:

Пасол І. Волянскі — на тэрыторыі Львоўскага апэляцыйнага суду не шануюць права украінскай мовы. Няма там нават каму прыняць паўкраінску прысягі. Украінцы аддаленыя і аддаляюцца ад судоўніцтва, нотарыяту і судовых экспэртаў

Пас. Велікановіч.—Лік украінскіх школаў усьцяж зьмяншаецца. Ад 1922 г. украінцы страцілі 500 школаў. На 6 мільёнаў украінцаў ёсьць толькі 5 дзяржаўных гімназіяў з украінскай мовай навучаньня. Закон аб заснаваньні ўкраінскага унівэрсытэту з 1922 г. ня выкананы. З 4.000 украінскіх вучыцялёў 1.500 асоб перакінутыя ў каронную Польшчу. Новых вучыцялёў улада ня прыймае.

Была парушана ўкраінская справа і ў Сэнаце.

Сэнатар Луцкі, між іншым, сказаў — у польскай унутранай палітыцы найважнейшым ёсьць тое, каб яна (палітыка) лічылася з фактам, што ў Польшчы жывуць не адныя палякі, але таксама і іншыя народы. Украінцам ідзе аб тое, каб усе грамадзяне былі роўныя прад законам і каб мелі магчымасьць свабодна працаваць.

Пасьля прысуду сьмерці—на волю. З турмы ў Равічы надоўчы выпусьцілі на волю палітычнага вязьня Івана Вербіцкага, каторы ў справе забойства куратара Сабінскага быў двойчы засуджаны на сьмерць; пасьля памілаваны заменай на 15 гадоў катаргі. Вербіцкі прасядзеў 9 гадоў і цяпер звольнены на бязтэрміновы адпачынак.

Бібліятэка Украінскай Акадэміі Навук. Бібліятэка УАН у Кіеве гэта адна з найбольшых бібліятэк у сьвеце. Яна мае 4 мільёны томаў кніг, а так-жа вельмі многа, больш 300 тысяч, цэнных старых друкаў.

Украінскія эмігранты ня маюць прыпынішча ў Чэхаславаччыне. У зьвязку з польска-чэхасла-

Redaktar Ludwik Abramowič

(U 30-tyja ŭhodki jaho redaktarskaj pracy)

28 lutaha sioleta minuła roŭna 30 hadoŭ, jak Ludwik Abramowič pačaŭ swaju pracu na niwie hazetnaj, na niwie hramadzkaj publicystyki. Nia hledziačy na toje, što L. A. jość palakom, praca jaho nastolki šyrokaja, što jana nia mieścicca ŭ ramkach adnej tolki polskaj nacyi, ale siahaje daloka hłybiej i šyrej. Praca jaho datyča tak-ža i našaha biełaruskaha narodu i dzieła hetaha daje nam prawa i abawiazak zabrać hołas i paświacić jamu choć hetych niekalki skromnych zaciemak, bližej z im zaznajamlajučy biełaruskaje hramadzianstwa, biełaruski narod.

Ludwik Abramowič rodam z našaha Kraju; baćki jaho tutejšyja, krajowyja palaki; radziŭsia ŭ Maskwie; akademickija studyi adbyŭ u Charkawie i ŭ Krakawie, pad kaniec 1905 h. pačaŭ žyć u Wilni, jakuju zaŭsiody lubiŭ jon usiej dušoj.

Tut, u Wilni 28 lutaha 1906 h. L. A. pačaŭ swaju hramadzkuju publicystyčnuju pracu ŭ „Gazecie Wileńskiej," jakuju załažyŭ Michał Romer, ciapierašni prafesar i rektar Litoŭskaha Ŭniwersytetu im. Witaŭta Wialikaha ŭ Koŭni. Čaławiek hety swajej wybitnaj intelihiencyjaj, siłaj prakanańnia i konsekwencyjaj mieŭ na maładoha L. A. wialiki ŭpłyŭ u kirunku krystalizacyi jaho palityčnych pahladaŭ ahułam, u kirunku ŭrešcie jaho krajowaści.

Paśla L. A. byŭ adnym z hałoŭnych siabroŭ redakcyi „Kurjera Litewskiego" jaki, jak wiedama, wychodziŭ u tej-ža Wilni.

U pieršych hadoch wajny L. A. prabywaŭ u Waršawie, dzie pracawaŭ na niwie palityčnaj ŭ kirunku demokratyčnym. Kali ŭ Krai našym niastała niamieckaj akupacyi, L. A. uznoŭ wiarnuŭsia ŭ Wilniu, dzie śpiarša redahawaŭ „Gazetu Krajowuju," a paśla wiedamy nam „Przegląd Wileński."

„Przegląd Wileński" pad redakcyjaj L. A. pačaŭ wychodzić niešta ŭ 1909-10 h. Wajna hetu jaho pracu piererwała. Wydawiectwa „Przegl. Wileńskiego" L. A. uznawiŭ pa wajnie, niešta ŭ 1922-3 h.

Prad wajnoj L. A., choć zaŭsiody byŭ ščyrym i konsekwentnym demokratam, adnak jaŭna i rašuča nie wystupaŭ prociŭ polskaha nacyjanalizmu. I heta zrazumieła — polskaja nacyja była tady hruba kryŭdžana nastupam carskaha imperyjalizmu i baranicca ad jaho było pieršym zadańniem. Kali-ž paŭstała niezaležnaja Polšč i kali demokratyčnyja ideały L. Abramowiča nia zbylisia, kali polski nacyjanalizm, prybraŭšy agresyŭnyja formy, pačaŭ dawacca ŭ znaki niapolskim narodam litoŭska-biełaruskich ziamiel našaha Kraju, jon całkom jaŭna i rašuča pačaŭ wystupać prociŭ hetaha „radzimaha" polskaha nacyjanalizmu ŭ abaronie napadanych i kryŭdžanych litoŭcaŭ i biełarusaŭ. Dokazam hetaha služa kožny numar „Przeglądu Wileńskiego," jaki dzieła hetaha staŭsia šyroka wiedamy siarod biełaruskaj i litoŭskaj intelihiencyi i ahułam siarod usiej — nažal nia tak mnohaj — krajowaj demokracyi.

L. A. ŭ „Przeglądzie Wileńskim" raźwiwaje ideolohiju, wiedamaju pad imiem krajowaj. Ideolohija heta Kraj naš, heta znače ziemli byŭšaha Wialikaha Kniaztwa Litoŭskaha, razważaje jak całaść, a narody, jakija žywuć na hetych ziemlach, liča narodami roŭnapraŭnymi.

Nia budziem tut ani staracca bližej i kankratniej pradstawić krajowuju ideolohiju L. A., ani tak-ža wykazwać jaje dadatnych i adjomnych staron, ani wykazwać, u čym my z jej zhadžajemsia, a ŭ čym nie,— ale tolki skažam ahułam, što henaja krajowaja ideolohija — heta susim pazytyŭnaja, śmiełaja i česnaja sproba raźwiazki nacyjanalnych prablemaŭ narodaŭ litoŭska-biełaruskich ziamiel. U akančalnym wyniku raźwiazki hetych prablemaŭ, krajowaja ideolohija L. A. — na naš pahlad—adyhraje nie paślednniuju rol.

Praŭda, staronnikaŭ — asabliwa ŭ polskim hramadzianstwie, jakoje ŭ swajej bolšaści fanatyčna praniata polskim nacyjanalizmam — krajowaja ideolohija L. A. maje niamnoha. Kali ŭ 1926 h. pamior šyrokaj i dobraj sławy T. Wrubleŭski, jaki byŭ, jak wiedama,tak-ža haračym staronnikam krajowaj ideolohii i jaki mieŭ wialiki ŭpłyŭ na ŭfarmawańnie hetkaj-ža ideolohii L. A., možna było pačuć hałasy, što L. A. — heta ŭžo apošni z epihonaŭ krajowaj idei, idei Wialikaha Kniastwa Litoŭskaha.

Wiera adnak u swaju ideolohiju L. A. nie pakidała, i jon dalej snuŭ swaju krajowuju dumku. I snuŭ jaje niedaremna. Z boku hledziačy, treba siańnia śćwierdzić fakt, što ŭžo polski nacyjanalizm mnohim i z pasiarod palakoŭ pačynaje pryjadacca i što faktyčna staronnikaŭ krajowaj idei prybywaje. Dokazam hetaha — apراča niekatorych inšych — služyć taja polskaja maładaja intelihiencyja, jakaja hrupujecca kala časapisu „Po prostu." Takim čynam, u 30-yja ŭhodki swajej hramadzka-publicystyčnaj pracy L. Abramowič moža paciešycca, što praca jaho, ŭsioždyki, daje płady.

Dla poŭnaści musim jašče adciemić, što L. A. adznačyŭsia nia tolki na niwie publicystyki, ale tak-ža i na niwie nawuki. I tut jon wierny sabie, wierny swajej ideolohii, i tut jon krajowiec, jaho pieršaja knižka: „Problem Litwy podčas wojny światowej." Źbiór dokumentów, uchwał, odezw i t. p. Waršawa, 1918. Słowa „Litwa" ŭ hetaj knižcy abymaje i biełaruskija ziemli, a dakumenty, u hetaj knižcy sabranyja, datyčać tak-ža i biełaruskaha palityčnaha wyzwaleńnia.

Druhaja knižka L. A. „Cztery Wieki Drukarstwa w Wilnie 1525—1925". Wilnia, 1925. Jak heta widać choć-by tolki z jaje zahałoŭku, jość jana tak-ža adbićciom krajowaści jaje aŭtara. Kali-ž kiniem wokam na źmiest hetaj knižki, dyk prakanajemsia ab hetym jašče bolš: spatykajem tam pieršy raździeł ab našym słaŭnym Skarynie, jaki pieršy na ŭschodzie Eŭropy ŭ 1525 h. drukawaŭ u Wilni swajho „Апостола" i „Малую падарожную кніжыцу," ab drukarni Mamoničaŭ, u jakoj drukawaŭsia ŭ 1588 h. Litoŭski Statut i šmat, šmat čaho inšaha, što jość krajowym i, miž inšym, naleža adnačasna tak-ža i da prajawaŭ biełaruskaj kultury ŭ minuščynie.

Kančajučy hetyja ŭwahi ab pracy L. Abramowiča, wykazanyja z nahody 30-lećcia jaho redaktarskaj pracy, žadajem jamu i nadalej wytrywałaści ŭ tym-ža kirunku, padčorkawajučy, što praca jaho sapraŭdy jość karysnaj dla našaha Kraju i pryhožaj. A heta — dumajem — najlepšaja dla L. Abramowiča zapłata.

A. Sakalinski.

Paśla buntu ŭ Japonii

Krywawy bunt u Japonii, ab jakim my padawali ŭžo ŭ prošłym numary „B Kr.," ustrywožvŭ amal uwieś świet, asabliwa SSRR, Francyju, Anhliju i inšyja dziaržawy. Trywožnym hety bunt źjaŭlajecca dziela taho, što jon byŭ padniaty japonskimi wajennymi fašystami, jakija imknucca da ŭłady ŭ swajoj dziaržawie, kab paśla pačać wajnu z Sawietami.

Japonskim začynščykam wajny mety swaje ciapier asiahnuć nie ŭdałosia — bunt zdušany, buntaŭščyki zrabili nad saboj harakiri: pawadyry buntu sami pastralalisia, adzin z ich japonskim zwyčajem rasparoŭ sabie brucha.

Paśla likwidacyi paŭstańnia wyjaśniłasia, što premjer uradu Okada žywie — paŭstancy zabili zamiest jaho, jahonaha świahra, jaki nadta byŭ padobny da Okada.

Choć henaje paŭstańnie nie ŭdałosia japonskim wajennym fašystam, to ŭsio-ž taki jano wycisnuła swaju piačać u hramadzkaj apinii. Japonskaja armija wyjawiła swaje imknieńni da wajny i swajo niezadawaleńnie da „liberalnaj" palityki sučasnaha ŭradu. Hety bunt jašče raz pakazwaje, što japonskija wajskowyja kruhi, amal niezaležna ad uradu, wiaduć swaju zachopnickaju palityku ŭ Azii.

Padobny bunt japonskich aficeraŭ byŭ užo ŭ 1932 h. 15 traŭnia, kali japonskija wajskowyja kruhi taksama pratestawali prociŭ miakkaj palityki tahačasnaha ŭradu ŭ sprawie Mandžuryi i Kitaju. Tady japonskija marskija kadety zabili premjera ŭradu Inukaja, jaki tak-ža nie zhadžaŭsia z imperyjalistyčnym honam da wajny japonskich wajennych fašystaŭ. Rezultat tahačasnaha paŭstańnia wiedamy: Japonija pačała bolš zbroicca, pačałasia biezahladnaja imperyjalistyčnaja palityka ŭ Mandžuryi i ŭ Kitaju. Ciapier — zusim padobnaja historyja.

Maładyja japonskija imperyjalisty aburajucca na swaich palitykaŭ — starykoŭ, što jany niaenerhična i krychu bajaźliwa wiaduć Japoniju na padboj Azii, a paśla i ŭsiaho świetu. Dziela hetaha, woś, jość taki ćwiordy i strašny swajej žorstkaściaj pastupak japonskich aficeraŭ, pad pawadyrstwam maładoha paručnika Nanaki, jaki zrabiŭ sabie, paśla niaŭdałaha buntu, harakiri — rasparoŭ sabie brucha i hetak pamior.

Paśla hetych krywawych padziejaŭ u Tokio, treba spadziawacca, što i ciapier, jak i ŭ 1932 h., urad i parlamant paddaducca woli armii i Japonija pryśpiašyć wybuch nowaj imperyjalistyčnaj wajny ŭ Azii.

Ideolohija japonskich fašystaŭ.

Maładyja japonskija fašysty, asabliwa aficary armii i floty, šyrać ideolohiju h. zw. „abnowy Šowa."

„Šoŭ" — heta čas—para panawańnia ciapierašniaha mikady (cara) Hirohito. U 1936 h. pačaŭsia 11 hod „Šowa."

U hetym časie — pary, musić — pawodle dumki japonskich fašystaŭ— ździejśnicca ideał japonskaj dziaržawy na čale z mikadam, jaki pasłany na ziamlu samym Boham.

Ideolohija japonskich fašystaŭ u niekatorych pahladach zusim padobnaja da ideolohii niamieckich hitleroŭcaŭ. U joj wykazywajucca wielmi silnyja socyjalistyčnyja tendencyi. Prykład: Japonskija fašysty stajać prociŭ wialikaj ŭłasnaści — wialikija ziamielnyja abšary, fabryki i kapalni pawinny być ułasnaściaj mikady. Uwieś japonski narod pawinien być, jak adna siamja, dzie niama matarjalnaha wyzysku adnych druhimi.

Hetuju ideju — manarchična siamiejnaha socyjalizmu — japonskija fašysty chočuć pašyryć na cely świet. Jany ŭważajuć, što heta—misija ciapierašniaj japonskaj dziaržawy.

Słowam, japonski fašyzm maje bolšuju fantaziju za fašyzm italijanski i niamiecki — hitleraŭski fašyzm uważaje swaim zadańniem baranić eŭrapejskuju cywilizacyju, musolinieŭski fašyzm — prawodzić hetuju cywilizacyju kulamiotami, harmatami i trujliwymi hazami ŭ Afrycy, a japonski fašyzm stawić sabie abowiazkam spoŭnić „božuju" misiju socyjalnaj i palityčnaj pierabudowy całaha świetu.

вацкім непаразуменьнем церпяць украінскія эмігранты. Калі з Польшчы пачалі выселяць грамадзян Чэхаславаччыны, то з Чэхаславаччыны высяляюць польскіх грамадзян, у гэтым ліку і ўкраінскіх эмігрантаў з Галіччыны. Ужо выселілі каля 50 украінцаў.

Словам, палякі з чэхамі спорацъ, а ўкраінцам лабы трашчаць.

Japonskaja(?) prociŭsawieckaja praklamacyja

Apošnim časam siarod wilenskich biełaruskich dziejačoŭ niechta pašyraje prociŭsawieckuju praklamacyju. Sutnaść jaje ŭ tym, što jana koštam Sawietaŭ orjentuje biełarusaŭ na Japoniju.

Chto i čaho sapraŭdy ŭ hetaj praklamacyi choča, pakul što zrazumieć trudna. Siańnia možna tolki skazać, što heta, na naš pahlad, — rabota pachodzić z warožych dla biełarusaŭ krynic i što heta ŭsio biełaruskamu narodu ničoha dobraha nie waroža.

„Budźma pryjacielami" — pramowiŭ Hitler da Francyi

Paśla ratyfikacyi francuskim parlamantam sawiecka-francuskaha dahaworu ab uzajemnaj dapamozie ŭ wypadku wajny, u Niamieččynie pačali źmianiacca nastroi adnosna zahraničnaj palityki swajej krainy. Niamieckaja zahraničnaja palityka šukaje nowych daroh na ŭschod Eŭropy, praz parazumieńnie z Francyjaj.

Nadowiačy niamiecki kancler Hitler padaŭ da publičnaha wiedama swaje „sympatyi" da Francyi, jakija pradstaŭlajucca hetak:

Niamiecki narod u 90 proc. dawiaraje swajmu pawadyru (h. zn. Hitleru — red.), jaki praciahwaje ruku da Francyi i kaža — *„budźma pryjacielami"*. Wiedaju, što mnie nie dawierajecie ab čym kažu — zajaŭlaŭ Hitler, ale jak udasca mnie asiahnuć francuska-niamieckaje zbliżeńnie, dyk heta budzie najlepšym dokazam majej ščyraści. Nikoli niwodzien niemiec nie źwiertaŭsia da Francyi z hetkaj prapazycyjaj, jakuju ja (h. zn. Hitler — red.) zaŭsiody paŭtaraju. Dziela hetaha źjaŭlajecca dziŭnym toje, što francuzy dumajuć ab mahčymaści napadu z boku Niamieččyny. Chiba nikoli francuzy nia čytajuć niamieckaj presy, jakaja zaŭsiody ŭstrymliwajecca ad usialakaj napaści na Francyju i wykazwajecca ab francuzach wielmi prychilna. Kali-b ja dumaŭ napadać na Francyju, to ci-ž kazaŭ-by presie pisać ab francuzach prychilna. Baraćba klasaŭ jość absurdam i niamiecki narod heta zrazumieŭ. Ciapier zaklikaju da miru miž narodami i zapeŭniaju, što kancepcyja wiečnaj nienawiści miž Francyjaj i Niamieččynaj jość niedarečnaściu. Niamiecki narod pajšoŭ za mnoju, kali ja padniaŭsia pahadzić Niamieččynu z Polščaj, i niamiecka-polski dahawor tłumačyli, jak fakt majho dyplomatyčnaha sprytu. Paśla hetaha dahaworu niamiecki narod pačuŭ palohku. Chaču parazumieńnia z Francyjaj. My musim pracawać, kab henaje parazumieńnie asiahnuć i kab jano było trywałaje.

Słowam, Hitler šukaje parazumieńnia z Francyjaj i sulić joj bratniuju luboŭ i dobrasusiedzkaje sužyćcio, kab swabadniej prabracca na eŭrapejski Uschod i tam, paniawoliŭšy narody, utwaryć niamieckija kalonii.

Razhrom abisynskaj armii

Eŭrapejskija hazety padajuć, što italjancy ŭ Afrycy na paŭnočnym abisynska-italjanskim froncie razhramili abisynskuju armiju, jakaja ŭžo nia moža suproćstawicca italjanskaj napaści. Dziela hetaha, byccam, italjanskaje wojska nia maje ŭžo nijakaj pieraškody, apražča naturalnaj (biezdarožža), zajmać wialikija prastory abisynskaj dziaržawy.

Anhielskaja presa padaje tak-ža, što, byccam, negus — car Abisynii, źwiarnuŭsia telehrafična da anhielskaha karala z prośbaj pasiarednictwa miž abisynskim i italjanskim uradami, dziela biezadkładnaha zaklučeńnia miru.

Słowam, italjanski fašyzm užo hłytaje wolnuju i niezaležnuju dasiul afrykanskuju dziaržawu — Abisyniju, katoruju paniawoliŭšy, budzie na jaje terytoryi arhanizawać swaju kolonijalnuju ŭładu i niamiłaserna pry pomačy hetaj ułady eksploatawać wolnuju dasiul krainu.

Što-ž na heta „miratworčaja" Liha Narodaŭ?

Hetaja „Starucha", tak, jak našyja biełaruskija „esery" — nia moža wyrašyć pryncypowaha pytańnia. Liha Narodaŭ jašče ŭsio rašaje sprawu prawiadzieńnia sankcyjaŭ prociŭ italjanskaj napaści na Abisyniju.

„Ciotka Biurcia"

Pad hetkim zahałoŭkam polski dwutydniowik „Przegląd Wileński" źmiaściŭ feljeton, za katory Nr. 3 „Przeglądu Wileńskiego" byŭ skanfiskawany, adnak sud kanfiskaty nie zaćwierdziŭ i daŭ mahčymaść jaho nadrukawać u nastupnym numary. Padajom tut jaho ŭ dasłoŭnym pierakładzie z polskaha. Red.

Chto-ž heta taki „ciotka Biurcia"?.. Tak adrazu wyjaśnić niemahčyma. Treba pačać ad taho, jaki sapraŭdy stroj panuje ŭ Polščy. Usim wiedama, što respublikanski, ale heta jašče ničoha nie haworyć. Moža być respublika demokratyčnaja, arystokratyčnaja, plutakratyčnaja, dyktatarskaja i h. d. Słowa „respublika" aznačaje tolki toje, što niama ani karala, ani cezara, a jość prezydent. Znajem takuju respubliku, dzie panuje dyktatura adzinki, i znajem takuju monarchiju, dzie prawić parlamant, abapiorty na hramadzkuju apiniju. Trudna zrazumieć, jak heta sapraŭdy jość u Polščy. Pa dobrym adnak abdumańni hetaj sprawy, možna dajści da prakanańnia, što ŭ hetych časach Polščaj prawić wielmi miłaja asoba, a imienna „ciotka Biurcia".

Poŭnaje jaje imia maje złučeńnie dwuch elementaŭ, jakija wywodziacca z wielmi adlehłych ad siabie epokaŭ. Pieršyja dwa składy dała nam u nawiejšych časach francuskaja mowa i aznačajuć jany niešta padobnaje da piśmiennaha stała, jaki časta maje, jak heta kažacca ŭ prykazcy, „stałowyja nohi". Apošnija dwa składy wywodziacca z stara-hreckaj mowy i aznačajuć uładztwa, panawańnie. Zhetul całaje imia ciotki „Biurci" u pierakładzie na polskuju mowu značyła-b — niešta jak-by „stała-ŭładztwa", a ŭ walniejšym pierakładzie „panawańnie stałowych noh". Nia budziem adnak užywać poŭnaha imieni našaj uładaryni i nazawiom jaje ciopła i piaščotna ciotkaj „Biurciaj". Heta prypaminaje niejak „ciotku Imku", katoraj taksama nichto nie nazywaje poŭnym imianiem.

Ciotka „Biurcia", pawodle raspaznańnia mnohich lekaraŭ dziaržaŭnych chwarobaŭ, chwareje na lišni pierarost swajho cieła. Tučnaja heta dama pawinna, čymchutčej, paddacca adtłuščajučamu lekawańniu. Śmieła mahła-b stracić prynamsi paławinu swajej żywoj wahi. Było-b heta karysna i dla jaje samoj i dla abawiazkaŭ, jakija jana maje spaŭniać. Ale ciotka „Biurcia" jość upartaja i zamiest taho, kab chudać — uściaž paŭnieje. Dziela hetaha ŭtrymańnie jaje kaštuje bolej, čym jaje wołaści mohuć nastarčyć.

Paddawanaja, čas ad času, doślедam daznanych psychijatraŭ ciotka „Biurcia" wykazwaje stała ŭzrastajučuju maniju wialikaści. Jana pryznaje siabie za niepamylnuju i nie pieranosie inšaha skazu aproč tolki swajho ŭłasnaha. Asabliwa ciarpieć nia moža hałasoŭ h. zw. hramadzkaj apinii, chiba što hetaja apošniaja wyražaje pahlady, zrodžanyja na jaje biurku. U praciŭnym wypadku ciotka „Biurcia" mocna hniewajecca i začyniaje wusny ŭsim praciŭnikam, abo začyniaje samych praciŭnikaŭ. Hetkaja taktyka maje toj dobry bok, što ciotka „Biurcia" adchilaje ad siabie prykraści wysłuchoŭwańnia taho, što dumaje i haworyć jaje naŭkolnaść, jakija tam daśpiawajuć pahlady, jakija ŭzrastajuć nastroi, ab katorych ciotka „Biurcia" moža dawiedacca raptoŭna i niespadziawana, kali jany nastolki padymucca, što parwuć usie zaharody i tady panawać nad imi budzie pozna. Ciotka „Biurcia" hetym nia nadta prajmajecca, zważajučy, što treba trymacca tajesamaje taktyki, jakoju kirawałasia pierad wajnoju jaje rasiejskaja swajačka: dušyć tyja hałasy hramadzkaj apinii, jakija nie zhadžajucca z jaje skazami. Ach, kab heta možna było ŭdziaržać życcio ŭ jaho rečyščy!.. Ciotka „Biurcia" była-b z hetaha wielmi zdawolena.

Adnak heta nia značyć, što ciotka „Biurcia" ničoha nia tworyć i trywaje ŭ poŭnym supakoi. Ciotka „Biurcia" maje adnu chwarobliwa raźwituju jaraść. Jana lubić pisać, wielmi mnoha pisać. Pisańnie stajecca źmiestam jaje życcia. Nie adzin dochtar-paznawalnik pakiwaŭ haławoju i skazaŭ: grafomania acuta. Nia wiedaju dobra, što heta značyć, ale byccam nawat lačeńnie ŭ klinicy tut mała što pamahło b.*) Takoju ŭžo musić i pamre ciotka „Biurcia". I čaho jana nia piša?.. Cyrkulary, wyjaśnieńni, kamentary, zahady, instrukcyi, statuty, ustawy. Niwodnaja z jaje zahraničnych tawaryšak nie prajaŭlaje stolki pisarskaha razmachu, jak naša „ciotka Biurcia". U papiarowym akijanie tonie časta zdarowy rozum, życciowaja metnaść, praktyčnaja patrebnaść, a dziaržacca na wierchu adny parahrafy i artykuły. Hetyja nia tonuć, bo jany ŭ siaredzinie pustyja...

Pry ŭsim hetym ciotka „Biurcia" jość wielmi zachopnickaj. Jana starajecca abniać swaimi palčykami ŭsie prajawy życcia, jakija stanowiać dzialanku prywatnaj pracy i pačynańniaŭ. Niwodzien z hetych intaresaŭ joj nie ŭdajecca. Jaje haspadarka papiarowaja spatykajecca z deficytami, nia wydzieržywaje proby życcia, ale heta jaje nia pužaje. Jana biarecca achwotna da promysłu, da handlu, lubić mieć mnoha lasoŭ i nia lubić ich addawać nawat na mocy sudowaha prysudu; u apošnich časach uziałasia za rybu. Maje tuju paciechu, što na hetych intaresach nia moža stracić, bo sama ničoha nie maje i za jaje haspadarčyja štuki i pamyłki płacić... Hrecyja. Jak heta dobra rabić kiepskija intaresy za čužyja hrošy! Z takoha giešeftu možna dobra żyć. Dyk ciotka „Biurcia" żywie i paŭnieje, choć... Hrecyja chudaje.

Padobna da spraktykawanych ŭładaroŭ, ciotka „Biurcia" kidaje z wyšyni swajho pasadu i puskaje ŭ chod šumnyja kličy, jak: „Aščadnaść jość bahaćciem narodaŭ", abo: „Chaj żywie radasnaja tworčaść", abo: „Kuplajcie bilety dziaržaŭnaj loteryi", abo: „Frontam da šeraha čałavieka", abo: „Cukar uzmacniaje", abo: „Karystajciesia z pošty", abo: „Ješ ryby, budzieš zdarowy jak ryba" i h. d. Kličy hetyja zwyčajna zużywajucca skora. Paśla karotkaha życcia jany hasnuć i pierachodziać u skład abstukanych frazaŭ, ale ŭ praciahu niekatoraha času ich deklamujuć na ŭsialakija tony i ŭhary i ŭnizie, pakul nia pryjdzie moda na inšuju frazu, jakaja maje ŭratawać ajčynu.

Ciotka „Biurcia" była-b moža ludzinaj trahičnaj, kab bačyła sama siabie, kab umieła krytyčna spahlanuć na swaju dziejnaść, ale pryrodnaje dobraje prakanańnie ab swaim pasłanstwie zabiwaje ŭ jaje ŭsiakaje sudžeńnie ab samoj sabie, ab inšych sudžeńniach jana nia choča čuć. Dyk nie darasła jana, jak sceničnaja ludzina na doškach świetu, da trahičnaje roli. Nie chwataje joj świedamaści, jakoju praniaty ŭsie wialikija dramatyčnyja ludziny. Dziela hetaha dziejnaść jaje tak časta nadajecca na temy da wiasiołych feljetonaŭ. Ale heta tak-ža jość časta śmiech praz ślozy...

Pierakłaŭ W.

*) Tut aŭtar feljetonu padaje wydumanuju chwarobu, u jakoj čałavieku wielmi chočacca pisać (prypiska pierakładčyka).

Roznyja wiestki

З ЦАРКОЎНАГА ПАГОСТУ.

Праваслаўная царква на украінскіх землях ужо паступова прыбліжаецца да народу — адкідае ў царкоўна-рэлігійным жыцьці маскоўшчыну і ў гэтым жыцьці карыстаецца мовай украінскай.

У палавіне мінулага м-ца адбылося ў Крэмянцы епархіяльнае сабраньне Валыні, на якім абгаварваліся справы царкоўных патрэб у духу народна-украінскім; само сабраньне і нарады вяліся паўкраінску — на пачэсным мейсцы стаяла статуя Т. Шэўчэнкі.

Пара гэткім шляхам ісьці ў народ і нашаму, беларускаму духавенству.

Z POLŠČY

Dyplomatyčnyja haściny. Polskaja presa apošnimi časami wielmi šyroka piša ab pryjaźni Polščy z Belhijaj, a heta tamu, što ciapier u Belhii haścić polski ministar zahraničnych spraŭ pałk. Bek, jaki tak ža ŭ swaich pramowach padčyrkiwaje henuju haračuju polska-belhijskuju pryjaźń.

Hetyja haściny majuć palityčny charaktar i źjaŭlajucca adnym z kołak u łancuhu eŭrapejskaj miždziaržaŭnaj palityki. Pry hetym nie adreču adznačyć, što Belhija staić na platformie francuskaj mižnarodnaj palityki, jakaja nakirawana prociŭ Niamieččyny.

Iznoŭ poŭnyja turmy. Niadaŭna abwieščanaja amnestyja, jakaja mnohim darawała sudowyja kary, aparažniła wastroh nienadoŭha. Polskija hazety padajuć, što ŭ Polščy wastrohi ŭžo iznoŭ pierapoŭnienyja. Pajaśniajuć henaje źjawišča tak: wypuščanyja z wastrohu, pawodle amnestyi, zładziei pačali masawa kraści i z hetaj pryčyny waročalisia znoŭ u wastroh, prywodziačy z saboju nowych prastupnikaŭ.

Niedabor u dziaržaŭnym budžecie—90 miljonaŭ złotych. Padčas naradaŭ u Senacie ŭ budžetnaj kamisii b. premjer Kazłoŭski, u pramowie ćwierdziŭ, što hramadzkija hrošy ŭ Polščy wydajucca nie zaŭsiody na patrebnyja sprawy. Baraćba ŭradu z kartelami nie asiahnuła mety. Wialikija karteli isnujuć dalej. Źnižki cenaŭ nasielnictwa nie adčuwaje. Haspadarka ŭ dziaržaŭnych lasoch pahanaja. Dziaržaŭny budžet maje 90 miljonaŭ zł. niedaboru.

Z ZAHRANICY

Aŭtanomija Katalonii. Paśla pieramohi ŭ Hišpanii, u parlamanckich wybarach lewicy, usplyła na wierch sprawa adnaŭleńnia aŭtanomii Katalonii. Nowy hišpanski ŭrad deklarawaŭ, što kataloncam buduć wiernieny ŭsie prawy, jakija im naležacca pawodle katalonskaha statutu.

Kara śmierci za zhawor prociŭ cara ŭ Baŭharyi. Letaś ŭ Baŭharyi byŭ wykryty zhawor aficaroŭ, jakija mieli padniać paŭstańnie prociŭ cara Barysa i prociŭ isnujučaha ładu ŭ dziaržawie. Niadaŭna adbyŭsia nad hetymi aficarami wajenny sud, jaki haloŭnych winoŭnikaŭ zasudziŭ na karu śmierci.

Školy tancaŭ u SSRR. Balšawicki dyktatar, Stalin niadaŭna kinuŭ klič „radasnaha žyćcia“ ŭ SSRR. Paśla hetaha kliču paŭstała ŭ Sawietach mnoha školaŭ tancaŭ. U Leninhradzie ŭ 10 hetkich školach wučacca tancawać 10.000 asob. Najachwatniej tancujuć narodnyja tancy.

Sawieckija wajennyja łahiery ŭ Čechasławaččynie. Hazety padajuć, što ŭ Čechasławaččynie jošć sawieckija wajennyja łahiery, u jakich raspałožany azbrojenyja čyrwonaarmiejcy z swaimi arapłanami i aŭtamabilami.

Heta pryhatawańnie suproć napadu Niamieččyny na prybałtyckija dziaržawy.

Pieratasoŭka ŭ Kominternie

Z Maskwy padajuć, što ŭ Kominternie adbyłasia pieratasoŭka — na miesca wiedamaha baŭhara Dzimitrawa naznačany K. Radek.

Pieramiaščeńnie Dzimitrawa wyklikana byccam trudnaściami ratyfikacyi sawiecka francuskaha dahaworu ŭ francuskim parlamancie, a tak-ža z pryčyny nieparazumieńnia Sawietaŭ z Paŭdzionnaj Amerykaj.

Dzimitraŭ wyjechaŭ u Krym na adpačynak.

Пісьмы з вёскі

Асадніцкае прадстаўленьне.

Пятровічы Хомскія, Норыцкае вол. Пастаўскага пав. Дня 15 лютага сёлета адбылося ў нашай вёсцы асадніцкае прадстаўленьне. Прадстаўленьне было не абы якое, але надта сьмяхотна - трагічнае. Кіраўнік прадстаўленьня — асаднік, быў п'яны. Сьпярша гэты „культурнік“ падняў калатню, а пасьля пачалася і бойка. Пайшлі ў „ход“ ня толькі палкі, але і нажы. Разышліся абкрываўленыя,

Дня 22 лютага сёлета было другое асадніцкае прадстаўленьне— у Ласіцы. Кіраваў прадстаўленьнем тойсамы асаднік, які беларускую моладзь абзываў хамамі.

Дарагая моладзь, не прыглядайся на асадніцкія прадстаўленьні, а лепш вазьміся за сваю, беларускую культурную работу —чытай газэты, кніжкі і ладзь свае беларускія прадстаўленьні!

Пракананы.

Весткі з нашай вёскі.

Місуны, Пастаўскага пав. Чытаючы „Беларускую Крыніцу,“ спатыкаем шмат карэспандэнцыяў з вёсак, у якіх апісваецца жыцьцё сялян ва ўсім нашым краю — Зах. Беларусі.

Вось і я пастанавіў напісаць у „Бел. Крыніцу“ аб жыцьці ў нашай вёсцы, асабліва аб жыцьці нашай моладзі.

Нашая вёска складаецца з 45 хатаў і гаспадарскіх будынкаў пры кожнай хаце. Жыхары—большасьцю мала-зямельныя сяляне; усе па нацыянальнасьці беларусы, але маласьведамыя і зусім нясьведамыя. Газэтай мала хто цікавіцца — чытаюць яе лічаныя адзінкі. Моладзь у большасьці зусім нясьведамая. У нас няма ніякае арганізацыі. Культурнае жыцьцё ў нашай вёсцы не разьвіваецца. Сяляне п'юць гарэлку і граюць у карты — некаторыя прапіваюць і праігрываюць апошнія грошы, а ў ік хаце бяда, няма чым і бульбы пасаліць. У гэтакіх абставінах жыцьця шырацца сямейныя сваркі і агулам сямейныя нелады, якія выклікаюць бойкі, а пасьля і суды. З гэтае прычыны ня могуць зжыцца бацькі з дарослымі дзяцьмі і з імі дзеляцца.

Гэтак жывуць — таўкуцца ў горы нашыя сяляне, і амаль ніхто ня думае аб лепшай долі, аб выхадзе з сучаснай нядолі і агулам аб лепшым жыцьці. У гэтакіх варунках гадуецца і нашая моладзь, якая, асабліва мужчынская, зусім глухая на хараство і ня мае эстэтычнага чуцьця. Дзяўчаты нашыя пад гэтым паглядам вышэй стаяць. Яны любяць свае беларускія песьні і надта часта, сабраўшыся разам, сьпяваюць іх.

Заклікаю нашую моладзь да культурна-асьветнай працы — да чытаньня беларускіх газэт, кніжак, сьпяваньня беларускіх песьняў, а так-жа да сарганізаваньня бібліятэкі-чытальні і агулам да лепшага — вышэйшага жыцьця.

В—бей

З царкоўнага жыцьця ў нас.

Асінагародцы, Пастаўскага пав. Царкоўна-рэлігійнае жыцьцё ў нас заняпала — людзі ў царкву мала калі заглядаюць. Прычына гэтага заняпаду знаходзіцца ў самой-жа царкве. Поп у нас — маскаль і да народу ў царкве прамаўляе парасейску. Нашыя прыхаджане беларусы і парасейску амаль нічога не разумеюць, асабліва маладшае пакаленьне, якое ў нас ня помніць расейскага панаваньня і парасейску нідзе ня вучылася, а папоўскай гутаркі ў царкве ня слухае. Апрача гэтага, поп у царкве так паступае, што і старэйшыя перастаюць туды заходзіць.

Сумнае зьявішча, але віна ў гэтай справе ўся з боку папоў, якія не стараюцца быць з народам і для дабра гэтага народу працаваць. Нашыя папы трымаюцца расейшчыны ў царкоўным жыцьці, а нашыя людзі трэбуюць, каб у царкве пропаведзі былі пабеларуску.

Агулам кажучы, трэба ў нас заводзіць у царкву беларускую мову, бо інакш, дык царква зусім апусьцее. Пры гэтым трэба, каб папы паходзілі з нашага народу і каб яны разам з народам дабіваліся лепшай долі для беларусаў. Калі-ж царква будзе апірацца і падтрымліваць сільных гэтага сьвету, то яна станецца народу непатрэбнай і народ ад яе адвернецца. Царква ў нашым Краю павінна абапёрціся на беларускім народзе і для дабра гэтага народу працаваць.

Н. Ч.

Naša wioska.

Jaśkawičy, Niaświskaha paw. Naša wioska raspałožanaja ŭdoŭž rečki Uša, jakaja ŭpływaje ŭ Nioman, a hetaja strojnaja našaja raka wody swaje niasie praz biełaruskuju krainu ŭ Bałtyckaje mora. Wioska našaja wialikaja — maje 130 haspadaroŭ. Ziamli mała: 440 dziesiacin nadzielnaj i 127 hektaraŭ kuplenaj. Ludzi našyja — heta świedamyja biełarusy. Pamižnašych sialan jošć niekatoryja ludzi nadta razumnyja.

Susiednija wioski razyjšlisia ŭžo na chutary, a našaja wioska staić na miescy. Znajšlisia i ŭ nas achwotniki chutaroŭ dy pasłali da ŭładaŭ prašenie. Ułady pasłuchali i wydali pastanowu ab kamasacyi našaj wioski. Mnohija haspadary chutaroŭ nia chočuć i starajucca ŭstrymać kamasacyju.

Jošć u nas ramieślanyja ludzi, jakija ad času sioje toje zmajstrujuć nieramieślanamu susiedu. Ciapier hetyja ramieśniki abłožanyja padatkami i musiać płacić pa 4 zł. 50 hr. u „Izbu Žemieśniču,“ kab pakryć raschody hetaj ustanowy. Karyści-ž našym ramieśnikam z hetaj „Izby“ tolki hetulki, što treba płacić joj padatki. Admowicca płacić hetych nałohaŭ nielha, bo pryjaždžaje sekwestratar, dapiswaje da hetaj sumy za „upomnienie,“ za „ekzekucyju“, i zabiraje što tolki moža, a paśla wystaŭlaje na licytacyju j pradaje.

Apračа hetaha, „Izba“ trebuje, kab ramieśniki zdawali ekzaminy prad adpawiednaj kamisijaj i mieli adpawiedny „dyplom“, jaki kaštuje bolš 100 zł. Zarablajuć-ža našyja ramieśniki nadta mała — zarabotkami z ramiasła trudna zapłacić ramieśnickaha padatku.

U našaj wioscy jošć try kramy spažywieckija. Maje być i krama z harełkaj. Ale kab hetaj, apošniaj, nia było, to pryhažej wyhladała-b wioska. Jošć u nas hurtok Biełaruskaha Instytutu Haspadarki i Kultury, jošć „pažarnaja straža“ i polskaje „koła.“ Jošć tak-ža i małačarnia, jakaja źjaŭlajecca filijaj susiedniaj małačarni. U našych arhanizacyjach—u hurtku BIHiK i ŭ polskich „kołach“ adbywajecca ŭsio pabiełarusku. Hetaj zimoj ładzili nawat pradstaŭleńni pabiełarusku.

Adnym słowam, našaja moładź užo nacyjanalna świedamaja i polonizacyi nie paddajecca.

Prysutny.

Starastwa nie daje dazwołu na pradstaŭleńnie.

Šalciny, Brasłaŭskaha paw. U nas jošć hurtok Biełaruskaha Instytutu Haspadarki i Kultury, jaki šyroka wiadzie kulturna-aświetnuju pracu. Šyrejšuju aświetnuju pracu ŭ narodzie treba wieści i amatarskimi teatralnymi pradstaŭleńniami. Robić hetak i naš hurtok. Ale nie zaŭsiody Brasłaŭskaje starastwa daje dazwoła hetkaje pradstaŭleńnie. Sioleta hurtok BIHiK mieŭsia zładzić 9 i 16 lutaha biełaruskaje pradstaŭleńnie. Zaniali chatu ŭ W. Sadoŭskaj, pryhatawalisia i pasłali ŭ starastwa ŭ Brasłaŭ pa dazwoł. Starastwa ładzić pradstaŭleńnie zabaraniła tamu što „lokal nie odpowiada warunkom bezpiečenstwa publičnego.“ Woś i ŭsio — šyrejšy razhon kulturna-aświetnaj pracy prytrymany i hetamu „winawataja“ ciotki Sadoŭskaj chata. A henaja chata wyhladaje hetak: maje dwa wychady, nowaja, z padłohaj, stalawańnie wysokaje, wialičynia 3 na 4 sažni. Słowam, chata ŭ wioscy pieršaj klasy, jakoj wa ŭsiej wakolicy niama.

Pry hetym treba adznačyć, što ŭ hetaj chacie ŭžo adbywalisia pradstaŭleńni i tady warunki biazpiečnaści byli adpawiednyja. U hetakich chatach pa wioskach polskija „koły“ ładziać polskija pradstaŭleńni biaz pieraškody.

My baimsia, kab paśla hetkaha „unieruchomienia“ dziejnaści našaha hurtka Biel. Inst. Hasp. i Kult. starastwa nie zakryła jaho za biazdziejnaść.

Alniś.

Naša pošta

W—biej. Karaspandencyju atrymali, dziakujem, drukujem, pišycie čaściej.

Nowasady. Z Wašaha piśma nia možam zrazumieć čaho Wy chočacie i čaho damahajeciesia, napišycie wyraźniej.

Wał. Asipowič. Wašyja wieršy da druku nie padchodziać, pišycie ab žyćci sialan u Wašaj wakolicy, ale nia wieršam, a prosta, wyrazna prozaj.

Prakanany. Piśmo atrymali, dziakujem, karystajem, pišycie bolš.

Prysutny. Dziakujem, skaraciŭšy skarystajem.

N. Č. Atrymali, dziakujem, karystajem ab carkoŭnych sprawach pišycie čaściej.

Padawałka. Wialikuju karaspandencyju atrymali, dziakujem, skarystajem.

Беларусы павінны чытаць і пашыраць беларускую прэсу:

1. **„Беларуская Крыніца“** XX год **„Biełaruskaja Krynica“**, выданьня, палітычны, грамадзкі і літаратурны часапіс, выходзіць што тыдзень. Падпіска на год 4 зл., на паўгода — 2 зл. Адрас: Red. „Biełaruskaja Krynica“ Wilno, Zawalna 1—1.

2. **„Самапомач“—„Samapomač“**, V год выданьня, адзіны ў нас беларускі коопэратыўна - гаспадарскі часапіс, выходзіць рэгулярна што месяц. Складка на год 3 зл., на паўгода 1.75. Адрас: Red. „Samapomač“, Wilno, Połocka 9—4.

3. **„Шлях Моладзі“**, VIII-мы год выданьня, часапіс беларускай моладзі, выходзіць рэгулярна што месяц. Падпіска на год 2 зл., на паўгода 1 зл. Адрас: Red. „Šlach Moładzi“, Wilno, Zawalna 1—2.

4. **„Chryścijanskaja Dumka“**, 9-ty hod wydańnia, biełaruski katalicki časapis, wychodzić rehularna što miesiac. Padpiska na hod 3 zł., na paŭhodu — 1.50 zł. Adras: Red. „Chryścijanskaja Dumka“, Wilno, Zawalna 1—2.

5. **„Praleski“**, 3-ci hod wydańnia, biełaruski dziciačy časapis, wychodzić što miesiac. Padpiska na hod 1 zł. Adras: Red: „Praleski“, Wilno, Zawalna 1—2.

6. **„Калосьсе“**, 2-гі год выданьня, беларускі літаратурна-навуковы часапіс, выходзіць раз у тры месяцы. Складка на год 4 зл. Адрас: Red. „Kałośsie“, Wilno, Zawalna 1—2.

Беларуская газэта найтанейшая і найдаступнейшая. Пробныя нумары (апрача „Калосься“) на просьбу высылаюцца бясплатна. Пішэце выразна свае адрасы!

Redaktar Jan Paźniak. Biełaruskaja Drukarnia im. Fr. Skaryny ŭ Wilni, Zawalnaja 1 — 2. Wydawiec A. Šutowič